

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 7 (214) ТРАВЕНЬ 2016 ГОДА

БЕЛАРУСКАЕ ЗЛАМОЎНАЕ ПАЖАДАННЕ

Соль табе ў вочы, перац табе ў нос!

ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС

ФІНАНСАВАЕ СТАНОВІШЧА ТОЛЬКІ ПАГАРШАЕЦЦА

Нацыянальны статыстычны камітэт апублікаваў даныя аб сацыяльна-эканамічным развіцці раёнаў Беларусі за першы квартал 2016 г.. Статыстычныя даныя аб становішчы з фінансамі ў Гараджоцкім раёне засведчылі, што фінансавы крызіс у раёне паглыбляецца.

Ужо каторы год прадпрыемствы і арганізацыі раёна ў цэлым працуюць са стратамі. Пры гэтым чыстыя страты ад такой дзейнасці арганізацый раёна выраслі з 13,3 млрд. рублёў да 31,5 млрд. рублёў — у 2,4 разы больш, чым годам раней. Адпаведна рэнтабельнасць прадаж пайшла ў мінус і склала –1,3%, а колькасць стратных арганізацый дасягнула 65% — годам раней было 45%.

Адпаведна значна выраслі, як дэбіторскія пратэрмінаваныя запазычнасці, так і крэдыторскія. Перад нашымі арганізацыямі ўжо вінаваты на 35,3 млрд. рублёў, а годам раней было 30,7 млрд. рублёў — рост даўгоў на 15%. Гарадоцкія ж арганізацыі пратэрмінавалі па выплаце крэдытаў 346,3 млрд. рублёў, а ў 2015 годзе за першы квартал — 269,9 млрд. рублёў — рост на 28%.

Пры гэтым значна большымі тэмпамі расла запазычанасць за паліўна-энергетычныя рэсурсы — з 25,2 млрд. да 41, 7 млрд. рублёў — на 66% і пратэрмінаваная запазычнасць па крэдытах і пазыках — з 23,2 млрд. да 41,7 млрд. рублёў — ў 2,4 раза .

І ў дзейнасці арганізацый не прадбачацца зрухаў да лепшага...

Леанід Гаравы

РЫНАК ПРАЦЫ

ПАДЦВЕРДЗІЛІ НАЯЎНАСЦЬ 39 ВОЛЬНЫХ МЕСЦАЎ

За апошнія 30 дзён у базе вакансій па Гарадоцкаму раёну працадаўцы падцвердзілі наяўнасць толькі 39 вольных месцаў, з якіх 21 належыць унітарнаму прадпрыемству «Паўночны»

Пастанува 14 траўня ў рэспубліканскай базе вакансій па Гарадоцкаму раёну маецца 53 вакансіі на 86 працоўных месцаў. Але толькі 39 з іх абноўлены за апошні месяц. Пры гэтым з усіх прапануемых месцаў больш палова былі заяўлены яшчэ напачатку красавіка, ў сакавіку, а дзве вакансіі ад Гарадоцкага льнозавода датуюцца аж 22 лютым.

Найбольшая колькасць вольных месцаў маецца ва УП «Паўночны» — свінакомплекс у аграгарадку Пальмінка. Тут база даных была абноўлена 6 траўня. Таксама тут прапануецца і самы высокі заробак з усіх прапануемых у раёне — ветэрынарнаму ўрачу — 6 500 000 рублёў. Самы ж маленькі заробак ва УП «Паўночны» чакае спецыяліста ідэалагічнай працы са стажам з вышэйшай адукацыяй — 3 400 000 рублёў. Крыху больш прапануецца тут жывёлаводу з сярэдняй адукацыяй пры наяўнасці 5 разраду — 3 500 000 руб.

Самыя ж нізкія заробкі для спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй зараз прапануе КУСГП імя Свердлава для галоўнага заатэхніка і галоўнага агранома — 2 300 000 руб. Дзяржаўная прыродаахоўчая ўстанова «Карыцінскі мох» егеру і спецыялісту з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй на 0,5 стаўкі прапануе 1 150 000 руб пры пастаяннай працы ў адну змену.

Варта нагадаць, што паводле афіцыйных даных у Гарадоцкім раёне напрыканцы першага квартала гэтага году было зафіксавана ў цэнтры занятасці 103 беспрацоўных, што складае 1,1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва раёна. Усяго ж у эканоміцы раёна на канец лютага было занята 9119 чалавек, што на 355 менш, чым годам раней.

Л. Антонаў

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

НАВІНЫ ФУТБОЛА

КОМАНДА ГОРОДКА СЫГРАЕТ В ОБЛАСТНОМ ФИНАЛЕ

Команда Городка заняла 2 место в зональном турнире «Кубок Coca-Cola. Вступай в игру!» и вышла в финал областных соревнований, которые пройдут в г.Витебске 19 мая.

Корпорация «Coca-Cola» проводит турнир среди любительских школьных команд проводится в Беларуси с 2012 года по инициативе УП «Кока-Кола Бевриджиз Беларусь». С 2014 года официальными организаторами тур-нира также являются Ассоциация «Белорусская федерация футбола», Министерство образования и Республиканский центр физического воспитания и спорта учащихся и студентов.

«Кубок Coca-Cola» — соревнование для мальчиков 12-13 и девочек 12-14 лет из любых населенных пунктов страны и самый массовый детский турнир Беларуси. В минувшем розыгрыше приняли участие более 1500 команд из 1041 школы, что составляет 35% всех школ Беларуси.

В начале этой недели команда Городка успешно выступила на зональных соревнованиях в Витебске. Результаты игр юных футболистов такие: Городок-Бешенковичи-0-0; Городок-Орша-1-0; Городок-Витебский район-2-0; Городок-Дубровно-0-4; Городок-Шумилино-0-0. Голы у нас забили: Ковалёв-2, Николаев — 1.

Состав команды: Агамов, Гончаренко, Самусенко, Куряков, Николаев, Ковалёв, Кобайло, Михасёнок, Щуревич, Плющевский, Петрович, Кожеко.

По итогам турнира наша команда заняла 2 место и вместе с командой из Бешенкович вышла в финал областных соревнований, которые пройдут в г.Витебске 19 мая с участием 8 команд.

Республиканский финал состоится в Минске 1 июня 2016 года.

Л. Антонов

По информации: vk.com/club59713727

ЗВАРОТЫ ГРАМАДЗЯН

ПОПРОСИЛА ОТРЕМОНТИРОВАТЬ МОСТ, А ЕГО – СНЕСУТ

На просьбу женщины отремонтировать мост Городокским райисполкомом совместно с Межанским сельсоветом принято решение о незамедлительном сносе аварийного моста через р. Ловать сотрудниками Городокского РОЧС. Данное решение принято в целях обеспечения безопасности жизни и здоровья жителей Межанского сельсовета.

Недавно редакция газеты «Витьбичи» получила письмо от Т. Амброшко, в котором женщина рассказала о наболевшей проблеме. Татьяна Ивановна проживает в Витебске, но по наследству ей достался отцовский дом в деревне Комары, что в Городокском районе. На малую родину она ездит регулярно.

На общественном транспорте можно доехать только до деревни Межа, а до Комаров еще около 8 километров. Раньше, чтобы сократить расстояние все ходили по мостику через речку Ловать. Но за долгие годы эксплуатации он обветшал и перемещаться по нему стало небезопасно. Вот и просит Татьяна Ивановна, чтобы местная власть помогла в реконструкции, тем самым сделав доброе дело для жителей и дачников не только деревни Комары, но и Долганы.

Вот что на эту ситуацию газете сообщили в Городокском районном исполнительном комитете. В ответе за подписью заместителя председателя Р.Люлюк говорится, что с жителями Межанского сельсовета была проведена встреча. Им пояснили, что мост через речку Ловать, о котором идет речь в обращении, строился еще во времена бывшего совхоза имени А.Е.Козлова для прохода работников хозяйства на свиноводческую ферму по кратчайшему пути. Позже совхоз был реорганизован путем присоединения к КУСХП имени Димитрова, а хозяйство производственную деятельность в деревне Комары уже не осуществляет, ферма снесена. Этот мостик ни на чьем балансе не состоит.

После детального осмотра моста стало понятно, что сгнили деревянные сваи и их обвязка. Из-за этого мост прогнулся и наклонился. Пользоваться им небезопасно. На ремонт или строительство новой переправы средства не предусмотрены.

Ольга Мыслицкая

vitbichi.by

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

ИГРОМАНКА ПРОДАЛА ДОМ И ВЫДУМАЛА ИСТОРИЮ О МОШЕННИКАХ

Жительница Городка проиграла все деньги и написала заявление в милицию с просьбой найти мошенников, которые якобы за несколько месяцев обманом выманили у нее 60 тысяч долларов. Безработная утверждала, что неведомая минская фирма, привлекавшая вклады, пообещала утроить ее сбережения, пишет «СБ Беларусь Сегодня».

В итоге, мол, она вложила в «хорошее дело» не только крупную денежную заначку, но и бытовую технику. Сама оформила в банке кредит на крупную сумму и попросила сделать это свою мать. Чуть позже продала свой дом. А еще брала в рассрочку мобильные телефоны и продавала их, чтобы получить наличные. Несколько раз, якобы, фирма перечисляла ей «дивиденды». А потом там заявили, что средства закончились.

Подробности криминальной истории рассказал заместитель прокурора Городокского района Максим Зиновик:

— Показания «пострадавшей» о совершенном в отношении ее преступлении заняли несколько страниц. Получился настоящий детектив с множеством действующих лиц. Оперативникам предстояло разыскать десятки участников мошеннической схемы. Но уже при первоначальной проверке информации сотрудники милиции установили, что заявительница является постоянной посетительницей игровых клубов.

Шаг за шагом клубок вымысла распутывался. Оказалось, что 38-летняя дама пристрастилась к играм на автоматах вместе с мужем. Играли как минимум 2,5 года. Вынесли из дома матери драгоценности и бытовую технику. Потом продавали через ломбард и рекламные объявления свои строительные инструменты, материалы и многое другое: «ушли» даже бетономешалка, отопительные батареи, и в конце концов — сам дом.

Деньгами распоряжалась жена-игроманка, муж об истинном положении дел, якобы, не догадывался. А супруга никак не могла остановиться, все ждала большого выигрыша. На почве финансовых трудностей в семье, где воспитывается 15-летний ребенок, начались проблемы. Чтобы успокоить домашних, дама сама печатала на принтере поддельные справки об имеющихся, якобы, на ее счете финансах. Пытаясь избежать развода, была вынуждена подать заявление в милицию о мошенниках.

Теперь ей грозит наказание за заведомо ложное сообщение о преступлении.

Елена Бегунова
СБ Беларусь Сегодня

БРАКАНЬЕРСТВА

ПЫТАННЕ АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ

На мінулыя святы супрацоўнікі Гарадоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету затрымалі на возеры Нэгра браканьера з Віцебску. Усяго падчас святаў у Віцебскай вобласці было зафіксавана чатыры выпадку браканьерства, якія нанеслі прыродзе шкоду на 345 мільёнаў рублёў.

3 рыбацкімі сеткамі гарадоцкія інспектары злавілі жыхара Віцебска на возеры Нэгра ў Гарадоцкім раёне. Вылаўленых ім 45 асобін рыбы хапіла, каб падняць пытанне аб узбуджэньні крымінальнай справы і кампенсацыі 34 мільёнаў шкоды прыродзе, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

У Аршанскі раён на возера Арэхаўскае інспектары выехалі па сігналу, які паступіў на тэлефон даверу. Спачатку былі затрыманыя трое мясцовых жыхароў, у якіх канфіскавалі 500-метровую сетку і 27 кг рыбы (58 ляшчоў, 15 акунёў і 11 асобін іншых відаў). Праз некаторы час на возеры заўважылі яшчэ аднаго сецевіка ва ўлове якога апынулася 39 ляшчоў. Цяпер браканьеры павінны выплаціць за незаконны промысел — 153 і 82 мільёны рублёў адпаведна.

У той жа дзень на возеры Тэклец быў затрыманы ураджэнец Лепеля, які ўсталяваў дзве дробнаячэйныя сеткі (дыяметр вочка 1 см). У іх патрапіла 117 дробных рыбешек, у асноўным плоткі. Аднак кампенсаваць нанесеную прыродзе шкоду і за малую, і за буйную рыбу прыйдзецца па адной і той жа таксе. Грэбаванне правіламі абыйдзецца парушальніку ў 76 мільёнаў рублёў.

Л. Антонаў

ГІСТОРЫЯ

ФАЛЬСІФІКАЦЫІ ГІСТОРЫІ ВАЙНЫ

Расейскія ўлады заяўляюць пра спробы фальсыфікацый гісторыі другой сусьветнай вайны. Свабода з дапамогай прафэсійных гісторыкаў сабрала фальсыфікацыі той вайны, якія застаюцца ў беларускіх школьных падручніках і агучваюцца ў дзяржаўных СМІ Беларусі.

1. Вайна для Беларусі пачалася 22 чэрвеня 1941 году.

Першыя бомбы ўпалі на Горадню і Баранавічы ў верасьні 1939 году. Амаль тыдзень Берасьце (Брэст) было фактычна сталіцай Польшчы — увесь польскі ўрад уцёк у Берасьце. А потым ужо ў Румынію. Таму і кінулі на Берасьце танкавую дывізію Гудэрыяна. Немцы ўзялі Берасьце ўжо 14 верасьня і амаль цалкам яго зьнішчылі. Адным зь першых змагароў з фашыстамі быў Янка Брыль, які ваяваў зь першых гадзінаў вайны (ён апісвае гэта ў рамане «Птушкі і гнёзды»).

2. Напад Нямеччыны на СССР быў цалкам нечаканы.

На самой справе Сталін атрымаў каля 80 паведамленьняў ад савецкай агентуры пра падрыхтоўку нападу і ягоныя тэрміны. Папярэдзіў яго пра гэта і Чэрчыль. Іншая справа, што Сталін ні Чэрчылю, ні сваёй выведцы ня меў веры. Ён думаў, што Гітлер не асьмеліцца ваяваць на два фронты, што немцы рыхтуюць высадку ў Англіі (апэрацыя «Марскі леў»), а перакіданьне часткі войскаў на Ўсход — гэта такі манэўр, каб увесьці ангельцаў у зман.

Сталін нават перадаў у распараджэньне Нямеччыны звыш 20 транспартных караблёў, якія стаялі ў нямецкіх партах пад савецкімі сьцягамі і з савецкімі экіпажамі ў чаканьні пагрузкі нямецкага дэсанту. Раніцай 22 чэрвеня немцы захапілі гэтыя караблі без адзінага стрэлу. Невыпадкова на першым пасьля нападу пасяджэньні Палітбюро ЦК ВКП (б) Сталін даў вельмі грубую ацэнку таго, што здарылася: «Прас... лі!»

3. Узброеныя сілы Нямеччыны і яе саюзьнікаў шматкроць пераўзыходзілі ўзброеныя сілы СССР у эўрапейскай частцы краіны.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія па колькасьці войскаў, якія знаходзіліся ў заходніх памежных акругах, саступала войскам вэрмахту і саюзьнікаў Нямеччыны ў 1,3 раза — 3 мільёны 290 тысяч чалавек супраць 4 мільёнаў 306 тысяч. Але яна мела велізарную перавагу ў танках і самаходных гарматах (15 687 супраць 4170 нямецкіх, то бок больш як у 3,76 раза), у авіяцыі (10 742 самалётаў супраць 4642 — больш як у 2,32 раза) і ў артылерыі (59 787 гармат і мінамётаў супраць 42 600 — у 1,4 раза больш).

Калі ўлічыць савецкія войскі другога эшалёна, якія знаходзіліся ў заходніх абласьцях РСФСР, прылеглых да Эстоніі, Латвіі, Літвы, Беларусі, Украіны (а гэта больш за мільён чалавек), то і перавага ў колькасьці асабовага складу таксама была на баку Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

4. Гарнізон Брэсцкай крэпасьці мужна супраціўляўся каля двух месяцаў, скаваўшы значныя сілы вэрмахту.

Немцы занялі Берасьце 22 чэрвеня да 12 гадзіны дня. Умацаваньні (форты) Брэсцкай крэпасьці штурмавала 45-я стралковая дывізія вэрмахту, якая складалася з аўстрыйцаў. Тыя войскі, што стаялі ў крэпасьці, 22 чэрвеня сышлі адтуль у прылеглыя лясы і далей адыходзілі на ўсход. У крэпасьці засталіся афіцэры штабоў і ўпраўленьняў, камэндантаў, гаспадарчыя і іншыя падразьдзяленьні са складу 6-й і 42-й стралковых дывізій, памежнікі, чальцы афіцэрскіх сем'яў — усяго да 5 тысяч чалавек.

Гэтыя разрозьненыя часткі савецкая, а цяпер расейская і беларуская прапаганда называюць «гарнізонам». Абаронцы крэпасьці капітулявалі 30 чэрвеня. Толькі ва Ўсходнім форце купка салдат на чале з маёрам Гаўрылавым працягвала супраціўляцца цэлы месяц — да 23 ліпеня. Але ніякага стратэгічнага значэньня іх барацьба ня мела. Наагул, Берасьцем займаліся ўсяго дзьве дывізіі праціўніка (31-я і 45-я) — са 166, якія ўдзельнічалі ва ўварваньні.

5. «Лінія Сталіна».

Гэта сыстэма ўмацаваных раёнаў уздоўж старой заходняй мяжы СССР ад Карэльскага перашыйку да берагоў Чорнага мора. Будавалася яна з 1928 да восені 1939 году і называлася тады «лініяй Молатава» (а ў нямецкіх дакумэнтах — «лініяй Сталіна») — па аналёгіі зь «лініяй Мажыно», «лініяй Манэргейма». Паводле падручнікаў, Полацкі, Менскі, Слуцкі, Мазырскі ўмацаваныя раёны знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Гэта 966 агнявых збудаваньняў.

«Лінія Сталіна» магла весьці бесьперабойны артылерыйскі і кулямётны агонь. Задачай «Лініі Сталіна» было прыкрываць Менск.

Насамрэч на так званай «Лініі Сталіна» былі лякальныя баі, але вызначальнага ўплыву на ход ваенных падзеяў яна не зрабіла.

Дэмантаж «Лініі Сталіна» пачаўся з восені 1939 году, пасьля падпісаньня Пакту аб ненападзе і далучэньня Заходняй Беларусі. Да лета 1941 году дэмантаж «Лініі Сталіна» быў завершаны на 85%. Вось чаму немцы на пятыя суткі ўзялі Менск, і ніякіх баёў ад Берасьця да Менску не было.

6. На часова акупаванай тэрыторыі ўвесь народ падняўся на партызанскую барацьбу супраць акупантаў.

Паводле савецкіх і шэрагу беларускіх навукоўцаў, «партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі насіў агульнанародны характар. Колькасьць беларускіх народных мсьціўцаў перавышала 374 тысячы чалавек. Яны былі аб'яднаныя ў 1255 атрадаў, зь якіх 997 уваходзілі ў склад 213 брыгад і палкоў, а 258 атрадаў дзейнічалі самастойна». Так сьцьвярджае вядомы беларускі гісторык А. Каваленя.

Аднак савецкая статыстыка сучаснымі замежнымі гісторыкамі лічыцца вельмі завышанай, і таму агульнанародны характар партызанскай вайны ставіцца пад сумнеў. (Катлярчук А., Бэрнард К'яры. Штодзённасьць за лініяй фронту: Акупацыя, калябарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гады).

Паводле афіцыйных лічбаў, у партызанскім руху ўдзельнічала ня больш за 5% насельніцтва. На думку некаторых гісторыкаў, лічбы завышаныя ў 2–3 раза. Партызаны да вясны 1943 году не наносілі вэрмахту прыкметнай шкоды. А гісторыі пра неверагодныя подзьвігі групы Канстанціна Заслонава ў Воршы, атрада бацькі Міная (Шмырова) і іншыя такога кшталту — перабольшваньне.

Беларускія партызаны ў гады вайны забілі і паранілі 500 тысяч фашыстаў, немцаў і іхніх памагатых, сьцьвярджае афіцыйная статыстыка. Ніводная краіна сьвету не пацьвярджае такой колькасьці ахвяраў. Паводле дадзеных прафэсара Эмануіла Ёфэ, партызаны маглі забіць каля 100 тысяч. Прычым з забітых большасьць — калябарацыяністы (той, хто супрацоўнічаў з немцамі), а меншасьць — немцы. Партызан усяго было 374 тысячы. Шмат хто з камандзіраў партызанскіх атрадаў даваў завышаныя зводкі.

7. Белыя плямы. Беларусь пасьля вайны страціла свае тэрыторыі.

10 жніўня 1945 году быў прыняты закон аб савецка-польскай мяжы. Згодна зь ім Польшчы дасталася амаль уся Беластоцкая вобласьць (17 раёнаў), да таго ж 3 раёны Берасьцейскай вобласьці. Гарады Аўгустоў, Беласток, Бельск, Гайнаўка, Драгічын, Ломжа і іншыя сталі польскімі. Узамен БССР атрымала ўсяго толькі 15 вёсак на былой польскай тэрыторыі.

Такім чынам, Беларусь стала адзінай краінай зь ліку пераможцаў фашызму, якая страціла частку сваёй этнічнай тэрыторыі. Усе астатнія краіны забралі тэрыторыі (Літва — палову Курскай касы і вярнула Клайпеду; Польшча — Уроцлаў, узьбярэжжа Балтыйскага мора; Расея — Калінінград). У падручніках пра гэта ня пішуць.

Іна Студзінская
Радыё Свабода

РЭХА ПЕРАМОГІ

«КАК БУДТО НЫНЕШНЕЕ НАЧАЛЬСТВО ИМЕЕТ КАКОЕ-ТО ОТНОШЕНИЕ К ТОЙ ПОБЕДЕ»

В Беларуси День Победы отметили менее помпезно, чем в России. Власти постарались, в частности, минимизировать присутствие «георгиевской ленточки», которая после Крыма, войны на Донбассе воспринимается у нас неоднозначно. Не было в этот раз парада. Но по большому счету, белорусская идеологическая вертикаль не может отойти от советской матрицы празднования 9 мая.

Аллергия на казенщину

Многие мои знакомые принципиально проводят этот день вдали от тусовок с казенной символикой, банальными речами и пивом, потому что для них та война — прежде всего страшная трагедия, катастрофа на всех уровнях: глобальном, национальном, уровне отдельной семьи. Своей семьи.

Люди думающие убеждены, что та Победа не должна маскировать провалы, подлости, жестокость сталинского режима. И тем более не должна маскировать бездарность нынешних властей, пытающихся спекулировать на подвиге дедов и прадедов.

Лента фейсбука в эти дни поведала мне много трагических историй, контрастирующих с официозной бравурностью, — о позоре оккупации, оборотной стороне «партизанки», презрительном отношении коммунистического начальства к человеческой жизни как на фронте, так и в тылу, возвращении после победы в неволю в собственной стране... В иных семьях жертв репрессий «родных» властей оказалось больше, чем павших на той войне.

Судя по воспоминаниям, например, огромное число белорусских мужчин (в том числе мой дед Иосиф, пулеметчик) полегло в 1944-45 годах в боях с немцами в Восточной Пруссии. Не обученных как следует, необстрелянных, их бросали в самое пекло, в лобовые атаки на амбразуры — как бы в отместку за годы, проведенные под оккупацией. Будто эти люди были виноваты, что в 1941-м не попали под мобилизацию, потому что Красная Армия откатилась на сотни километров за считаные дни.

Правда и фальсификация: все перевернуто

И в России, и в Беларуси власти с раздражением реагируют на неприятную правду о той войне. В их трактовке «правда» — это удобная лакированная мифология.

Вот и Александр Лукашенко, выступая 9 мая на возложении венков к монументу Победы в столице, шаблонно повторил: «Мы не позволили и никогда не позволим исказить правду об этой победе, фальсифицировать и отнять ее у наших детей и внуков».

Официальный лидер также подчеркнул, что за период оккупации «наши партизанские отряды и соединения уничтожили более полумиллиона вражеских солдат и офицеров, не меньше, чем союзные армии США и Великобритании после открытия второго фронта».

«Мы»! Как будто нынешнее начальство имеет какое-то отношение к той Победе. А где ваши собственные победы? Вы что, приблизили свою страну материально к уровню Запада, тех же немцев? Как бы не так. Сегодня «белорусская модель», которая держалась на советской индустриальной базе и российских дотациях, коллапсирует. Убогость хозяйственного (как и прочего) мышления, непрофессионализм отечественных державных мужей высветились нынешним кризисом во всей красе.

Привязка к советской матрице

В целом масштаб торжеств в честь Дня Победы в Беларуси в последние годы снижается, что особенно заметно, если сравнивать с размахом и помпезностью празднования этой даты в России. Такой вывод делает политолог и историк, эксперт минского аналитического центра «Стратегия» Валерий Карбалевич.

В комментарии для Naviny.by онотметил:«Белорусскиевласти стараются дистанцироваться от характерного для России имперского концепта этого праздника. Но делают это мягко, чтобы не осложнить отношения с Москвой».

На некоторое отличие белорусского формата празднования Дня Победы от российского обратил внимание в комментарии для Naviny.by и минский историк, шеф-редактор журнала Arche Александр Пашкевич. По его мнению, различие «определяется тем, что, как бы ни относиться к нынешней белорусской власти, ей все же чужды имперскость и реваншизм».

Консервация унылого застоя

При этом, добавлю, белорусские власти не просто по инерции следуют ритуалу или продолжают его культивировать во избежание конфликтов с Москвой (где в последнее время и так модно будировать тему «батькиной измены»).

Нет, белорусское начальство использует то, что на казенно-пафосном сленге называется «наследием Великой Победы», достаточно прагматично и по-своему гибко. Власти спекулируют на военной тематике, исторической памяти белорусов о колоссальных страданиях, чтобы перевести стрелки, сместить фокус с собственных экономических провалов.

Не случайно, полагает Карбалевич, и открытие пятого Всебелорусского народного собрания — традиционного мероприятия в стилистике съездов КПСС — назначено на 22 июня, день начала Великой Отечественной войны. По мнению политолога, белорусам снова будут внушать, что нет ничего важнее мирного неба над головой.

«Власти смещают акцент на то, что главные уроки той войны — это необходимость сохранять мир, стабильность, порядок на белорусской земле», — отмечает Карбалевич.

И если отбросить искусственный пафос официозных ораторов, то в нашей ситуации это означает подвести базу под консервацию унылого застоя.

Александр Класковский
naviny.by

ГАНЕБНЫ РЭФЕРЭНДУМ

10 НЯПРАЎДАЎ ПРА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

14 траўня 1995 году адбыўся рэферэндум, які зрабіў рускую мову дзяржаўнай, а беларускую адсунуў убок. Старыя забабоны пра беларускую мову з таго часу не зніклі, а новыя набылі форму. Я сабраў дзесяць самых знаменных забабонаў і прэтэнзій да беларускай мовы, што дасюль выкарыстоўваюцца ў спрэчках.

1. Мова ўсяго толькі зручная прылада стасункаў.

Выказванне, з якім звыкла згаджаюцца. Але з яго само сабой вынікае, што варта карыстацца прыладамі, што маюцца пад рукой – а гэта, у сучаснае Беларусі – руская мова і рускія словы.

Сцверджанне гэтае – падступная недагаворка. Мова не толькі і не столькі прылада, колькі складаная сістэма светабачання, знітаваная з каштоўнасцямі. Мова накідае на свет сваё сеціва тлумачэнняў, што адрознівае мову адну ад адной, задае гульню сэнсаў. Беларускім "каханню" і "любові" адпавядае адна руская "любовь", "памяркоўнасць" амаль не перакладаецца, а зручная "шуфлядка" выклікае ў суседзяў ступар.

Лічыць мову проста прыладай не выпадае.

2. "Няма розніцы, якой моваю карыстацца".

Гэтае сцверджанне звычайна закладзенае ў пытанні: "А якая розніца?", якое гучыць (заўжды) на рускае мове. Чыноўніцкі варыянт такой "абыякавасці" – выказванне: "У нас дзве дзяржаўныя мовы".

Гэтае сцверджанне – нават прапісанае ў канстытуцыях (шматкроць зменены) – фактам не адпавядае. Атрымаць вышэйшую адукацыя на беларускае мове – справа амаль немагчымая (на ўсю краіну толькі трыста беларускамоўных студэнтаў), законы выдаюцца на рускае мове, на тэлевізіі беларускую мову, калі і адшукаць можна, то толькі гады ў рады. У сучаснае Беларусі розніца ёсць – і ў дзяржаўных інстанцыях яна на карысць рускае мовы.

3. Беларуская мова правінцыйная.

Беларуская мова калісьці гучала ў вёсках, але даўно перабралася ў горад. Сёння цікавыя – і нават элітарныя – рэчы гучаць на беларускае мове. За рускай мовай зарэзэрваваная пакуль масавая культура.

4.Яквыкладацьматэматыку, фізіку па-беларуску?

Сцверджанне блізкае да папярэдняга і ва ўшчэнт хлуслівае. Беларуская тэрміналогія добра распрацаваная, маюцца слоўнікі, падручнікі, энцыклапедыя. На беларускае мове выкладалася – і выкладаецца – матэматыка ў Беларускім гуманітарным ліцэі, які, нягледзячы на свой сённяшні падпольны статус, застаецца выдатнай адукацыйнай установай.

5. Час нацый прайшоў. Навошта чапляцца за мову?

Гэтае сцверджанне звычайна выкарыстоўваецца, каб абвінаваціць беларускую мову і людзей, што яе абараняюць – у рэакцыйнасці і адсталасці. Але чамусьці працэсы моўнага рэнесансу і аднаўлення нацый, што здаўна ўключаныя ў тыя ці іншыя дзяржавы, адбываюцца ў самых розных рэгіёнах Заходняй Еўропе, на якую спасылаюцца абвінавачвальнікі.

6. Пакінем усё як ёсць.

Пакінуць усё як ёсць ні ў кога не атрымаецца. Моўныя працэссы ніколі не стаяць на месцы. Умовы, што склаліся ў Беларусі – русіфікаваныя школы, тэлевізія, абсалютная дамінацыя расейскай інфармацыйнай прасторы – толькі спрыяюць далейшаму выціcканню беларускае мовы, якое, зрэшты, у лукашэнкаўскай Беларусі ідзе імклівымі тэмпамі (з 1995 года нават палову дашкольнікаў у вёсках выхоўваюць на рускае мове, чаго раней не было ані блізка). Каб захаваць хоць бы існы ўзровень беларускае мовы, трэба прыкладаць намаганні, якія "пакідальнікі" прыкладаць не збіраюцца.

7. Народ выказаўся на рэферэндуме. Большасць – супраць.

Праведзены з парушэннямі і махлярствамі рэферэндум не мае сілы. Мала таго, аніякі рэферэндум на гэтую тэму не будзе мець сілу, бо выказваца на конт мовы – што існуе праз пакаленні – мусяць не толькі жывыя, але й памерлыя і тыя, што яшчэ не нарадзіліся.

8. Навязванне беларускае мовы парушае правы чалавека.



Гэтае сцверджанне перапоўненае перакрутамі. Правы адна-го чалавека завяршаюцца там, дзе пачынаюцца правы другога. Для рускамоўнага чалавека ў Беларусі адкрытыя ўсе шляхі, беларускамоўны штодзень сутыкаецца з перашкодамі – і гэта ягоныя правы зацінутыя. Кажуць нават пра "лінгвацыд" – вынішчэнне беларускае мовы, як такавой.

Але ёсць яшчэ адзін чыннік. Мова – з'ява калектыўная, і калектыўная культурная каштоўнасць. За яе захаванне адказвае грамадства – і дзяржава, на тэрыторыі якой мова жыве. Пакуль гэтая адказнасць, што прадугледжвае пэўныя абавязкі, не праяўленая.

9. Гэта пытанне, увогуле, для грамадства не істотнае.

Калі гэтае пытанне такое неістотнае, то чаму на яго так нервова рэагуюць суседзі? Ім – што за справа? І чаму на гэтае "неістотнае" пытанне ўпарта рэагуюць "абыякавыя", якія сядзяць на беларускамоўных форумах, з пенай у роце даказваючы, што ім напляваць? Зрэшты, калі абыякавым напляваць, іншым не.

10. "Я асабіста не супраць беларускае мовы".

З гэтага выказвання звычайна пачынаецца выказванне пра беларускую мову. А потым следуюць усе ці асобныя ўзгаданыя аргументы. Калі чалавек, сапраўды, быў бы не супраць беларускае мовы, ён гэтымі аргументамі не карыстаўся бы.

Андрэй Расінскі
"Новы час"

ПРА БЕЛАРУСЬ

ЛЕНИВЫЙ НАРОД

Зацепило! Призыв Александра Лукашенко к белорусам работать еще лучше, а не кивать на власть, прозвучал полным издевательством.

Свою пламенную речь глава государства произнес совсем недавно, общаясь после пасхального богослужения с жителями Шклова. В частности, Лукашенко призвал граждан критически оценивать, прежде всего, результаты собственного труда, думая над тем, как работать еще лучше.

– Если мы начинаем друг на друга толкать, что это кто-то должен сделать, не я, это власть плохая, которая должна сделать – это плохо, это неправильно. Надо, прежде всего, смотреть на себя – а что я сделал?

Примечательно, что сообщить гражданам о том, что они недорабатывают, Лукашенко решил в День труда – 1 мая. Да и посыл не кивать на власть прозвучал с точностью наоборот: мол, сами виноваты – плохо работаете.

Впрочем, обвинять своих сограждан во всех экономических неудачах — давняя практика Александра Григорьевича. В 2014-м белорусы устроили ему в стране девальвацию, скупив в обменниках долларыинакупивавтомобилей.В2013-м обрушили легкую промышленность, вывезя из страны валюту и «привозя назад европейский мусор». В 2011-м подорвали золотовалютные запасы страны, устремившись на курорты в Египет. А потом и вовсе решили устроить в стране голод, разобрав в магазинах сахар и масло.

Теперь вот еще выяснилось, что и работают они не очень... А пока власть упахивается, нам стоит задуматься, где же мы так сильно недоработали?

Может, это крестьяне так плохо вскопали землю, что внешний госдолг вырос до рекордных 13 миллиардов долларов?

Или, может, рабочие так плохо трудились, что количество скопившихся на складах тракторов и прочей продукции превысил все возможные пределы?

Или, может, это ленивые работники предприятий так намылили глаз руководству, что оно больше не в состоянии было видеть их чаще трех раз в неделю, отправив в «незаслуженные» отпуска?

В общем, есть о чем задуматься. Хотя уже сейчас можно с точностью сказать, где именно белорусы недоработали и что до сих пор не сделали из того, что давно должны были сделать — это заставить власть уважать себя.

Анастасия Зеленкова
gazetaby.com

БЕЛАРУСЬ - РАСЕЯ

ГАЗАВАЯ ПАСТКА

Цяперашні беларуска-расейскі газавы канфлікт, які распачынаецца на нашых вачах, мала падобны да ранейшых. Тыя дамовы аб цэнах на газ, якія былі падпісаныя паміж Менскам і Масквою ў пэрыяд высокіх коштаў на энэргарэсурсы, тады былі выгадныя Беларусі. Цяпер, калі сусьветныя цэны на нафту ўпалі (а газавыя кошты ў значнай ступені прывязаныя да нафтавых), ранейшыя пагадненьні сталі нявыгаднымі для беларускай дзяржавы. Аднак Расея адмаўляецца іх пераглядаць, спасылаючыся на тое, што дамовы, на якіх у 2011 годзе настойваў Менск, трэба выконваць.

І вось у такой сытуацыі здарылася абвастрэньне канфлікту. Гаворка ідзе ня проста пра элемэнтарную завінавачанасьць, якой у беларускай эканоміцы цяпер шмат, бо ў прадпрыемстваў няма чым плаціць. У дадзеным выпадку беларускі бок пайшоў на абвастрэньне, пачаў дзейнічаць з пазыцыі сілы, стаў явачным парадкам усталёўваць сваю, «справядлівую», на думку Менску, цану на газ. Гэта не самадзейнасьць абласных арганізацыяў, якія займаюцца газазабесьпячэньнем. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра сьвядомую пазыцыю ўраду, прынятую на палітычным узроўні, яе агучыў віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка. Беларусь чыніць ціск на Маскву, каб тая ў гэтым пытаньні пайшла на саступкі.

Так часта бывала і раней, калі беларускі бок не прасіў, а патрабаваў ад Расеі саступак, ішоў на скандал. Узгадаем, напрыклад, калійную вайну 2013 году, калі кіраўніцтва Беларусі брутальна арыштавала гендырэктара расейскай кампаніі «Уралкалій» Уладзіслава Баўмгертнэра, патрабуючы кампэнсацыі за нанесеную шкоду і крыўду.

Як і тады, цяпер Лукашэнка таксама ідзе на публічны канфлікт, паводзіць сябе з Расеяй досыць сьмела, нават правакатыўна. Варта заўважыць, што падчас нядаўняга выступу ў Нацыянальным сходзе з пасланьнем кіраўнік дзяржавы даволі жорстка крытыкаваў РФ. Лепшы спосаб абароны, апраўданьнязапэўнаедыстанцываньне ад Масквы ў замежнай палітыцы — гэта наступ. Лукашэнка нават прыводзіў у прыклад пазыцыю Захаду, супрацьпастаўляючы яе расейскай. Паездка ў Стамбул — гэта таксама быў пэўны выклік Маскве.

У чым прычыны такой вольнасьці? На мой погляд, тут справа ў тым, што падзеньне сусьветных нафтавых коштаў разбурае адну з крыніц эканамічнай падтрымкі Беларусі з боку Расеі. Расейскі энэргетычны грант моцна зьменшыўся. Гэта значыць, што зьмяншаецца ступень эканамічнай залежнасьці Менску ад Масквы. І гэта дазваляе беларускаму кіраўніцтву паводзіць сябе больш свабодна ў дачыненьні да РФ.

І тут цікавая рэакцыя расейскага боку. У "Газпрома" ёсьць вельмі дзейсны рычаг ціску на Беларусь, які ён раней выкарыстоўваў шмат разоў. Расейская кампанія магла проста скарачаць пастаўкі газу ці хоць бы прыгразіць гэтым. Бо газавы кранік у яе руках.

І што ж робіць дзяржава, якая прэтэндуе на глябальную ролю ў сьвеце, якая ўступіла ў зацяты палітычны канфлікт з самімі Злучанымі Штатамі? Цяжка паверыць, але яна ў спрэчцы з бліжэйшым саюзьнікам апэлюе да міжнароднага права. Кампанія «Газпром трансгаз Беларусь», якой валодае «Газпром», падала пазоў у міжнародны арбітраж на беларускія абласныя газавыя структуры. Расея будзе судзіцца зь Беларусьсю! Выпадак унікальны. Звычайна беларуска-расейскія разборкі ладзяцца «па пацанскіх паняцьцях»: бакі высьвятляюць, хто больш круты. А вось цяпер усё мае вырашыць суд. Як казаў Лукашэнка, сьвет страціў розум.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

СУДОВЫ ПРАЦЭС

«НЕУЖЕЛИ ЗА 40 ЛЕТ РАБОТЫ Я НЕ МОГУ ПОСТРОИТЬ КОТТЕДЖ?»

Сенатор Анна Шарейко недоумевает, почему она, руководитель со стажем, должна оправдываться в суде за дом, дачу в глухой деревне, машину и любовь с литовским бизнесменом.

— Этот злосчастный дом — как бельмо для всех. Зачем я тогда работала всю жизнь, если не могу позволить минимальные блага в предпенсионном возрасте? Я не воровала у государства! — заявила во вторник в Верховном суде сенатор и директор Витебской птицефабрики Анна Шарейко.

Она говорила громко, четко, эмоционально, часто ссылаясь на цифры и статистику.

— Анна Васильевна зажигает, — говорили в перерыве адвокаты.

Напомним, уже третий месяц суд рассматривает громкое дело руководителя птицефабрики «Ганна». Вместе с ней в статусе обвиняемого оказались еще 6 человек. Следствие уверено: во время тендера на поставку кормов Шарейко лоббировала интересы компании «Русском-Р», которая фактически принадлежит ее литовскому возлюбленному Вальдемарасу Норкусу, и отклонила более выгодное предложение ОАО «Экомол», что привело к ущербу в 4 миллиарда рублей.

— Как можно так все перевернуть? О каком лоббировании идет речь? — не скрывала свое возмущение Анна Шарейко. — Никогда на планерках не говорила, что покупать премиксы нужно только у «Русском-Р». Как бы я потом смотрела в глаза специалистам? Я поступала честно, справедливо и верно. Никогда не обсуждала с Норкусом дома рабочие дела. У меня было два мира — дом и работа, и эти миры никогда не путала. Волосы вставали на голове, когда читала обвинение.

А дальше гособвинитель стал интересоваться всем: когда была продана квартира и построен дом? ночевал ли Норкус у Шарейко? когда они стали жить вместе? кто платил в ресторане за ужин?

— Все расскажу, мне нечего скрывать. Продав квартиру, одолжила денег у сестер под честное слово, до сих пор не рассчиталась. В 2009 году брала у Норкуса заем и вернула.

— Так где вы взяли деньги на строительство дома? — уточнил прокурор Метельский.

— Послушайте, я 40 лет работала. Неужели не могу построить коттедж в 230 квадратов, из них только 120 квадратов жилых. Чем этот дом отличается от других? В нем нет ничего сверхъестественного: стены покрашены краской, наполовину сделан из стекла, это позволило удешевить проект. Да, он выглядит не так, как все дома в Витебске, потому что его проектировали в Литве.

— Вы объездили полмира. За какие средства? — спросил гособвинитель.

— Следствие перепутало все поездки — и личные, и командировки. От птицефабрики я была в Италии, Израиле, Турции, Бельгии, Германии, Голландии... С Норкусом нас связывали только искренние, ничем не обремененные чувства. Я и теперь не знаю, что у него есть из имущества и на кого оно зарегистрировано.

— Чувства — это хорошо, но кушать хочется всегда, — отметил прокурор Метельский. — Кто платил за поездки?

— Норкус европейский человек, а я независимая женщина. Каждый платил за себя. Мы не вели совместного хозяйства, только договорились, что в новом доме я оплачиваю интернет, электроэнергию, вывоз мусора, а он — аквариум, бассейн и обеспечивает уборку.

— А в ресторане кто платил?

— Послушайте, неужели мужчина не может за меня заплатить? Да, я ела за его счет, — улыбалась Шарейко. — Меня удивило, что в материалах уголовного дела еще и технику в доме перечислили. Государственный обвинитель, вот у вас дома «Витязь» стоит? (прокурор улыбнулся, но промолчал. — Ред.). У меня, как и у всех, стоит Sony. И что? Следствие все перевернуло. Дом — это мое единственное жилье, счетов нет, бизнеса тоже, родственников перекопали, все живут скромно.

Анне Шарейко пришлось также объяснять, почему она звонила руководству «Русском-Р», зачем просила погасить перед ними долг.

— Не доводите все до абсурда. Это рабочие вопросы. В день у меня тысяча звонков. Пусть бы кто пожил в таком ритме, как работала я, сошел бы с ума, — отметила Шарейко. — Грамотному человеку понятно и видно, как проводилась проверка «Экомола» и Витебской птицефабрики. Если бы следствие согласилось провести экономическую экспертизу, все стало бы на свои места, но нам дважды отказали.

О том, что дела на фабрике теперь не очень, говорят и нынешние сотрудники, и те, кто сейчас сидит за решеткой. Согласно цифрам, озвученным в суде, в 2015 году предприятие недополучило прибыль в 194 миллиарда. А в предыдущих годах прибыль составляла 10 миллионов долларов.

— Если бы не отсутствовала руководство и ключевые специалисты, которые сейчас находятся под стражей, этого не было бы! Мы прошли такую закалку! У фабрики теперь трудное финансовое положение, не за что покупать добавки, корма. Специалисты напуганы правоохранительными органами и боятся выбрать лучшего производителя. Это правоохранительные органы наносят ущерб — и дальше все идет по наклонной? — уверена Анна Васильевна.

Единственный, кто выступил против Шарейко и ее команды — Владимир Лиоренцевич. Он единственный, кто остается на свободе и находится под подпиской о невыезде. На показаниях бывшего главного специалиста фабрики строится все обвинение. Однако в суде выяснилось: в тот день, когда Шарейко якобы вызвала его в кабинет и дала указание, чтобы тендер выиграл «Русском-Р», Анна Васильевна была за границей.

— Все слова лживые, и все заявления Лиоренцевича можно опровергнуть, — добавила Шарейко.

Процесс продолжается.

Катерина Борисевич
«Комсомольская правда в Белоруссии»

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 17.05.2016 у 17.40 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.